*З серыі “Знакамітыя людзі”*

*Ад рэдакцыі:* **Краіна страціла Зубра беларускай літаратуры**

Беларусь страціла Адама Іосіфавіча Мальдзіса (1932-2022) — пісьменніка, журналіста, літаратуразнаўца, крытыка, гісторыка, перакладчыка, доктара філалагічных навук, прафесара… Анатоль Грыцкевіч назваў яго Рыцарам Беларускага Адраджэння.

Беларускі інстытут навукі і культуры ў Канадзе і часопіс “Культура. Нацыя” спачувае сям’і Адама Іосіфавіча Мальдзіса з прычыны непапраўнай страты.

*Пётра Мурзёнак,*
*Старшыня БІНІМ, Канада,*
*рэдактар часопіса “Культура. Нацыя”*

**Сяргей Панізьнік: Памяці Адама Іосіфавіча Мальдзіса (1932-2022)**

Верш-прысвячэньне А.І. Мальдзісу і фотаздымкі з калекцыі Сяргея Панізьніка.

***З верша-прысвячэння Адаму Мальдзісу «Спадчыннікі»***

Будучыня, моцны твой падмурак!
Для усіх — зямлян і землякоў —
вырасталі помнікі культуры,
памяць нерастрачаных вякоў.

Бо цаглінка кожная у замку -
нашых продкаў скамянелы крык.
Толькі праца — вечная! І заўтра
праца — наш надзейны мацярык.

На дарозе творчага сталення
нам любоў за вернага ганца.
У тваіх, Радзіма, пакаленняў
столькі працы — не відаць канца!

*Сяргей Панізьнік, 1985*



*Адам Мальдзіс на балконе. Мінск, ліпень 1967 г.*



*Адам Мальдзіс з Альмай Лапінскене на запісе тэлеперадачы пра Янку Купалу. Вільнюс, 1981*

№29, красавік 2022 ISSN 2562-950




*Экслібрыс Вячкі Целеша, прысвечаны Адаму Мальдзісу. Рыга, 1982 г.*



*Юбілейнае вясельнае застолле. Частуе Адама Іосіфавіча яго жонка Марыя餘Каролеўна. 1.09.1984 г.*



*30-годдзе жаніцьбы Адама і Марыі весела адзначылі і ў двары.
На здымку Вера Мальдзіс, суседка Станіслава, Генадзь Васільевіч Кісялёў з жонкай Янінай Міхайлаўнай, Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч з жонкай Аляўцінай Цімафееўнай, злева ад Адама і Марыі — Вячаслаў Пятровіч Рагойша з жонкай Таццянай Вячаславаўнай Кабржыцкай, іх сынамі Пятром і Максімам, побач — Людміла Мікалаеўна Панізьнік.*



*Адам Мальдзіс з Мечыславам Яцкевічам у Доме творчасці «Іслач» на Міжнародным семінары перакладчыкаў. Ракаў, верасень1987 г.*



*Адам Мальдзіс на роднай Астравеччыне, ля дома ў в. Палушы. 23.04.1989 г.*



*У Доме літаратара — Рыгор Барадулін, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Анатоль Наліваеў, Сяргей Панізьнік. 19.05.1992 г.*



*У Музеі гісторыі беларускай літаратуры Адам Мальдзіс прамаўляе пра беларуска-латышскія літаратурныя сувязі. 2010 г.*



*Адам Мальдзіс перадае карціны мастака Валерыя Дзевіскібы для выстаўкі Міколу Купаву і яго памочніку Андрэю Янішчыцу. Верасень 2019 г.*

№29, красавік 2022 ISSN 2562-950




*Аўтограф Адама Мальдзіса на яго кнізе «І ажываюць спадчыны старонкі» (1994)*

**From editorial staff: Our Country Has Lost a Giant of Belarusian Literature**
***web-magazine "Kultura. Natsyja", issue 29, April 2022, 529-536, www.sakavik.net)***

Belarus has lost Adam Iosifavich Maldzis (1932-2022) – the writer, journalist, and expert in literature, critic, historian, translator, Doctor of Philological Sciences and professor. Anatol Hrytskievich called him the Knight of Belarusian Revival. The Belarusian Institute of Sciences and Culture in Canada and internet journal *Kultura*. *Natsiya* express their sincere sympathies to the family of Adam Iosifavich Maldzis on his passing from earthly life. **Article in honor A.I.Maldzis and images by Sergei Paniznik.**